# Калі выбіраеш «чыгуначны» шлях

**Дзеля прафесійнай арыентацыі моладзі, стварэння ўмоў для ўсвядомленага выбару чыгуначных прафесій і іх папулярызацыі па ініцыятыве Беларускай чыгункі распрацавана вучэбная праграма факультатыўных заняткаў «Увядзенне ў прафесіі чыгуначнага транспарту» для навучэнцаў X—XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Новы факультатыў з'явіцца ў школах краіны з 1 верасня.**

Вучэбная праграма прадугледжвае не толькі тэарэтычную падрыхтоўку дзяцей, але і правядзенне вытворчых экскурсій, семінараў, канферэнцый, выязных заняткаў з наведваннем аб'ектаў чыгуначнага транспарту, удзел у прафесійных конкурсах, якія арганізоўваюцца Беларускай чыгункай. Вучэбная праграма разлічана на 70 гадзін (па 35 гадзін у кожным класе, адна гадзіна ў тыдзень) і арыентавана на азнаямленне навучэнцаў з агульнымі абавязкамі работнікаў чыгуначных арганізацый, з іх дзейнасцю па забеспячэнні патрэбаў эканомікі і насельніцтва краіны ў чыгуначных перавозках і звязаных з імі работах і паслугах, забеспячэнні бяспекі руху і эксплуатацыі чыгуначнага транспарту.



Фота БелТА.

Для ўмацавання і развіцця кадравага патэнцыялу Беларуская чыгунка праводзіць вялікую работу па прафесійнай арыентацыі моладзі. Цяпер сумесна з установамі агульнай сярэдняй адукацыі ў краіне створаны і функцыянуюць дзевяць спецыялізаваных транспартных класаў чыгуначнай накіраванасці, у якіх праходзяць навучанне 213 навучэнцаў.

Штогод на Дзіцячай чыгунцы імя К. С. Заслонава таксама праходзяць навучанне розным чыгуначным прафесіям больш за 400 школьнікаў, 60 працэнтаў з якіх у далейшым працягваюць сваё навучанне ў прафесійна-тэхнічных, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах чыгуначнага транспарту.

Сяргей РАСОЛЬКА.